Дадатак да «Новых кніг БССР», 1991, № 9

# МАКСІМ БАГДАНОВІЧ

*(Да 100-годдзя з дня нараджэння)*

Рэкамендацыйны бібліяграфічны спіс

У родным краю ёсць крыніца
Жывой вады.
Там толькі я змагу пазбыцца
Сваёй нуды.

*Багдановіч М. «Дайно ўжо целам я хварэю...» (Т. 1. С. 99)**

## Жыццёвы шлях

Максім Багдановіч — гонар нашай літаратуры і яе боль. Ён так многа зрабіў і яшчэ больш не паспеў зрабіць за сваё кароткае жыццё. Усе, хто асабіста ведаў Багдановіча, успамінаюць яго як надта прыгожага чалавека: высокага юнака з правільнымі рысамі твару, з хвалістай прычоскай буйных каштанавых валасоў, з адухоўленымі вачамі, якія то здаваліся цёпла-блакітнымі, то загараліся карычневымі іскаркамі, і тады станавіліся карымі, задуменнымі. Кажуць, што ніводная з дайшоўшых да нас фатаграфій не перадае яго абаяльнасці. Быў Максім, па сведчанню бацькі, някрыўдлівы і мяккі, летуценны, з пяшчотным, амаль жаночым сэрцам і разам з тым у працы настойлівы і ўпарты. Менавіта з такой упартасцю адносіўся ён да вывучэння беларускай мовы.

Стаць беларускім паэтам М. Багдановічу было няпроста. Амаль усё сваё свядомае жыццё ён пражыў у рускім асяроддзі. Родную мову напачатку проста не ведаў. Нарадзіўся будучы паэт у Мінску. Бацька яго — Адам Ягоравіч — быў вядомым беларускім этнографам і фалькларыстам, аўтарам працы «Пережитки древнего миросозерцания у белорусов». Маці — Марыя Апанасаўна — вучылася на Вышэйшых жаночых курсах у Пецярбурзе, шмат чытала, была схільнай да мастацкай творчасці, нават спрабавала сама пісаць апавяданні. Раннія дзіцячыя гады Максіма прайшлі ў Гродне, а потым, пасля смерці маці ад скарацечных сухотаў у 1896 г., сям'я Багдановічаў перабралася ў Ніжні Ноўгарад. З 1908 г. Багдановічы жывуць у Яраслаўлі. Толькі ў сталым узросце паэт зноў апынуўся на Радзіме. Па выхадзе з гімназіі ў 1911 г. Багдановіч прыехаў на Беларусь, да якой увесь час імкнуўся. Тут у фальварку Ракуцёўшчына, непадалёку ад Маладзечна, правёў ён два месяцы. Беларускую мову Багдановіч вывучаў па кнігах, па слоўніках, настольнай кнігай яго быў «Словарь белорусского наречия» І. Насовіча. Вялікае значэнне мелі для яго апавяданні пра Беларусь бацькі, этнаграфічныя працы і зборнікі казак у дамашняй бібліятэцы. Дух беларускасці захоўвалі сем'і бацькавых сясцёр — Гапановічаў і Галаванаў. Цікавасць Багдановіча да Беларусі падтрымлівалі яго хросная маці Вольга Епіфанаўна Сёмава і

---

* Тут і далей цытаты з твораў паэта прыводзяцца па выданню: Багдановіч М. Збор твораў: У 2 т. (Мн.: Маст. літ., 1968). У дужках адзначаюцца том і старонка.

настаўнік гісторыі, беларус А. К. Кабанаў. Максім атрымліваў беларускія газеты «Нашу ніву» і «Нашу долю».

У 1907 г. у «Нашай ніве» быў змешчаны першы твор М. Багдановіча — кароткае лірычнае апавяданне «Музыка». Гэта дата лічыцца пачаткам яго літаратурнай дзейнасці. (Самыя раннія творы не захаваліся). Праз некаторы час пасля «Музыкі», у 1909 г. у той жа «Нашай ніве» убачылі свет два вершы паэта «Над возерам» і «Вадзянік», якія пазней увайшлі ў цыкл «У зачараваным царстве».

Юнака вабіла вучоба ў Пецярбургскім універсітэце, яго нават рэкамендавалі акадэміку А. А. Шахматаву. Але матэрыяльныя ўмовы і стан здароўя не далі здзейсніць гэты намер. М. Багдановіч паступіў у Яраслаўскі юрыдычны ліцэй. Юрыспрудэнцыя не цікавіла Максіма. Увесь свой вольны час ён праводзіў у беларускім зямляцтве, дзе наладжваліся лекцыі па гісторыі роднага краю, чыталіся беларускія вершы, спяваліся беларускія песні. Тут адчуваў ён сябе шчаслівым. У гэты час паэт шмат чытае, вывучае рускую і замежныя літаратуры, піша, супрацоўнічае ў мясцовых газетах і часопісах. У 1913 г. выйшаў адзіны яго прыжыццёвы зборнік вершаў «Вянок» — найлепшы ўзор паэтычнага майстэрства беларускай літаратуры пачатку XX ст., у якім арганічна спалучыліся нацыянальныя і класічныя агульнаеўрапейскія паэтычныя традыцыі. Пасля гэтага зборніка паэт паспеў апублікаваць толькі некаторыя свае творы. М. Багдановіч становіцца вядомым аўтарам. Яго прымаюць ва Усерасійскае таварыства дзеячаў перыядычнага друку, ганаровымі членамі якога былі Максім Горкі і Караленка.

Вайна 1914 года і тыя нечуваныя бедствы, якія яна прынесла Беларусі, сцвердзілі Максіма ў рашэнні пакінуць Волгу і назаўсёды перабрацца на Радзіму. І ў 1916 г., скончыўшы ліцэй, ён прыязджае ў прыфрантавы Мінск. Пасяліўся паэт на кватэры вядомага беларускага пісьменніка Змітрака Бядулі ў доме на Мала-Георгіеўскай вуліцы (вул. Л. Талстога) і пачаў працаваць у Мінскім губернскім харчовым камітэце, створаным па ініцыятыве творчай інтэлігенцыі горада з мэтай дапамогі пацярпеўшым у імперыялістычную вайну. У камітэт уваходзілі беларускія пісьменнікі і дзеячы беларускай культуры Ядвігін Ш., У. І. Галубок, Зоська Верас, В. Лявіцкая, Р. Зямкевіч. Сярод гэтых людзей добра, як у сям'і, адчуваў сябе паэт. Пры камітэце існаваў клуб пад добра вядомай сучаснікам назвай «Беларуская хатка». Тут наладжваліся вечары паэзіі, беларускай народнай музыкі і песні. У Мінску Багдановіч многа і плённа працаваў. Успаміны ўсіх, хто быў побач з ім у гэты час, сведчаць, што ён з галавой аддаваўся грамадскім справам, зусім не дбаў пра сваё здароўе. Пачалася яго праца па складанню беларускага буквара, над літаратурнай хрэстаматыяй для пачатковай школы, быў напісаны шэраг нарысаў. Лебядзінай песняй М. Багдановіча стала створаная ў Мінску паэма «Страцім-лебедзь». Пагібельная хвароба, якая ўвагнала ў магілу маці і старэйшага брата, прымусіла Багдановіча зноў пакінуць Беларусь. У лютым 1917 г. ён едзе ў Ялту. Адзінокі, безнадзейна хворы правёў ён тут чатыры апошніх месяцы свайго жыцця. Добра вядомыя радкі:

> У краіне светлай, дзе я ўміраю,
> У белым доме ля сіняй бухты,
> Я не самотны, я кнігу маю
> З друкарні пана Марціна Кухты.
>
> *(Т. І. С. 278)*

— перадсмяротнае прызнанне паэта, бадай, адзінае ў сваім родзе ва ўсёй сусветнай паэзіі. Пахаваны М. Багдановіч у Ялце на Аўцкіх брацкіх могілках. На шэрым надмагільным камені — імя, дата смерці і страфа з санета «Паміж пяскоў Егіпецкай зямлі...» аб нязгаснай жыццёвай сіле жытнёвых зярнят.



### Крыху пра творчасць

Дзесяць гадоў свайго кароткага жыцця аддаў М. Багдановіч літаратуры. Ён быў не толькі выдатным паэтам пачатку XX ст., аўтарам пейзажнай, любоўнай, сацыяльна-філасофскай лірыкі, фальклорна-эпічных паэм, але і самабытным празаікам-апавядальнікам, эсэістам, майстрам паэтычнага перакладу, бліскучым літаратурным крытыкам, глыбокім вучоным-даследчыкам. Буйнейшаму, арыгінальнейшаму мастаку слова — яму дастаткова было толькі «Зоркі Венеры», каб абяссмерціць сваё імя, а былі яшчэ «Мяжы», «Слуцкія ткачыхі», «Зразаюць галіны таполі адну за адной...», славутая «Пагоня».

*Творы пра Бацькаўшчыну*

Лірыка Багдановіча багатая і разнастайная па сваіх тэмах і вобразах. Паэт цалкам належаў свайму часу і свайму народу. Як вялікі мастак адлюстраваў ён рэальныя бакі тагачаснай рэчаіснасці, паказаў гаротнае, бяспраўнае жыццё народа. Усеахопнай страсцю была любоў Багдановіча да далёкай роднай Беларусі. Наведванне летам 1911 г. Беларусі стала падзеяй у творчым жыцці паэта. Паездка паўплывала на стварэнне цыкла «Старая Беларусь», у які ўвайшлі вершы «Летапісец», «Перапісчык», «Кніга», «Безнадзейнасць» і інш. Праз гэтыя вершы паэт дае адчуць характар старой беларускай культуры. Сапраўдным шэдэўрам цыкла з'яўляецца добра вядомы верш «Слуцкія ткачыхі». «Цвяток радзімы» — васілёк становіцца ў паэта сімвалам свядомасці народа, незалежнасці яго эстэтычных уяўленняў ад іншаземных густаў паноў. Сучасны беларускі літаратуразнавец і крытык Р. Бярозкін высока цаніў вершы Багдановіча на гістарычную тэму. У грунтоўным даследаванні творчасці Янкі Купалы і Максіма Багдановіча ён піcаў: «Кожная нацыянальная паэзія раней ці пазней ажыццяўляе пераход ад рамантычна-інтуітыўных „праглядаў“ гісторыі, ад пошукаў аналогій у мінулым да сапраўды рэалістычнага гістарызму. У беларускай паэзіі гэты пераход звязаны перш-наперш з імем Максіма Багдановіча, аўтара твораў накшталт „Безнадзейнасці“»*.

Неадступна гняла паэта думка аб бяспраўным становішчы беларускага народа. Праўдзівыя, бязрадасныя малюнкі беларускай вёскі з шэрымі, струхлеўшымі хатамі, чарнеўшымі саломай гнілых стрэх, малюнкі гаротнага жыцця беларусаў ва ўмовах царызму перадае Багдановіч у вершах «У вёсцы», «Доля мужыка», «Мяжы». Неадольным было яго жаданне перайначыць лёс Бацькаўшчыны. Вершы «Народ, Беларускі Народ!..», «Краю мой родны! Як выкляты богам...» — праграмныя творы паэта. Услед за Я. Купалам Багдановіч узнімаецца да разумення агульнанародных, агульнанацыянальных задач, гаворыць аб месцы беларускага народа сярод іншых народаў.

Адным з самых драматычных твораў Багдановіча, у якім гучыць матыў злітнасці з роднай зямлёй, дзейснай, да апошняга дыхання, любові да яе з'яўляецца верш «Пагоня».

> Маці родная, Маці-Краіна!
> Не ўсцішыцца гэтакі боль...
> Ты прабач, Ты прымі свайго сына,
> За Цябе яму ўмерці дазволь!..
>
> *(Т. І. С. 273)*

«Пагоня» — гэта грозны прысуд здраднікам, адшчапенцам, тым, хто выракаецца сваёй бацькаўшчыны, пакідае яе:

---

* Бярозкін Р. Звенні: Творчая індывідуальнасць і ўзаемадзеянне літаратур. Мн., 1976. С. 106.

Бійце ў сэрцы іх — бійце мячамі,
Не давайце чужынцамі быць!
Хай пачуюць, як сэрца начамі,
Аб радзімай старонцы баліць...

*(Т. 1. С. 272)*

### *Зачараванае царства*

Працягам тэмы Радзімы з'яўляецца ў Багдановіча тэма прыроды. На самым пачатку сваёй творчасці паэт уяўляў Беларусь па казках і легендах, паданнях ды народных павер'ях, што месціліся ў бацькавай бібліятэцы. І сама беларуская зямля здавалася яму дзівоснай казкай са старымі барамі і цёмнымі, прывольнымі пушчамі. Адсюль і раннія вершы Багдановіча аб роднай прыродзе, населеныя міфалагічнымі істотамі, прасякнутыя духам язычніцкіх павер'яў,— цудоўны сплаў народнай фантазіі і душэўнага настрою паэта. Вершы гэтыя складаюць «своеасаблівую старонку ў беларускай пейзажнай лірыцы, старонку, якую ў сілу абставін мог напісаць толькі Багдановіч і якую нельга паўтарыць»*. Вось п'яны ад снежнага хмелю, гудзіць і кружыцца падвей. Касматы лясун то самотна і панура брыдзе па дзікім лесе, то ляжыць стомлены, успамінаючы сваю даўнейшую ўдаласць і сілу. Белы месяц цягне з возера срэбныя сеці, у якія русалкі заблыталі свае косы. Сівавусы, згорблены залёг між цінай, спіць на дне ракі вадзянік. Лесуны і падвеі, вадзянікі і русалкі так арганічна ўведзены ў паэтычную структуру вершаў, склаўшых цыкл «У зачараваным царстве», што зусім не псуюць харства рэалістычных малюнкаў. Побач з узорамі пейзажнай лірыкі, звязанымі з народнай міфалогіяй, у творчасці Багдановіча нямала праніклёных радкоў аб роднай прыродзе, напісаных у рэалістычнай манеры. З крыштальнай яснасцю ставарае паэт малюнак зімы:

Здароў, марозны, звонкі вечар!
Здароў, скрыпучы, мяккі снег!
Мяцель не вее, сціхнуў вецер,
І волен лёгкіх санак бег.

*«Зімой» (Т. 1. С. 50)*

Пейзаж Багдановіча раскрываецца ў цеснай сувязі з яго настроямі, думамі, душэўнымі перажываннямі. Музыка прыроды — гэта музыка сэрца, таксама, як музыка сэрца — музыка прыроды, гаворыць паэт у вершы «Па-над белым пухам вішняў...». Багдановіч цудоўна перадае фарбы і гукі прыроды. Лірычныя пейзажы яго рухомыя, дынамічныя. Яго вабіць час змяркання, пераходу дзённага святла ў цемень і золак, «той дзень, што мае нарадзіцца, і знікшы дзень». «Багдановіч лічыўся б выдатным паэтам і тады, калі б ён нам пакінуў толькі вершы аб роднай прыродзе. На шчасце, яго паэтычны талент раскрываўся так шчодра не толькі ў пейзажнай лірыцы...»**.

### *Інтымная лірыка*

Зачараванае царства ў М. Багдановіча не толькі царства прыроды, гэта яшчэ і царства кахання. Ён адзін з самых інтымных беларускіх лірыкаў. Сапраўдным гімнам жыццю, услаўленнем усяго маладога і прыгожага з'яўляецца верш «Маладыя гады». Не адно дзесяцігоддзе хвалявала і хвалюе чытачоў чароўная «Зорка Венера...» («Рамансь). Гэта верш аб каханні як душэўнай уласцівасці чалавека, аб каханні ўвогуле, чымсьці каханні. Калі ж паэт гаварыў аб сваім пачуцці, узмацняліся ноткі суму і нявер'я. Звязана гэта было з цяжкай хваробай, з усведамленнем таго, што жыць суджана нядоўга. Узорам любоўнай лірыкі Багдановіча стала вершаванае апавяданне «Вераніка». У ім створаны вобраз каханай паэта, поўны высокай красаты і чароўнасці. Даследчыкаў творчасці Багдановіча заўсёды цікавіў прататып гераіні гэтага твора. Вывучаючы творчасць паэта, Н. Б. Ватацы прыйшла да высновы, што прысвечаны ён сястры Максімавых таварышаў па гімназіі братоў Какуевых — Ані, гераіні многіх іншых яго аўтабіяграфічных твораў. Усе вершы, прысвечаныя Ані, паэт меркаваў сабраць у адзін цыкл «Палын-трава», але зроблена гэта не было. «А. Р. К.—Анне Рафаілаўне Какуевай — прысвяціў Максім Багдановіч цыкл «Мадонны», сваё запаветнае разуменне прыгожага, якое паэт шукаў у штодзённым жыцці народа»*. Мадонна для Багдановіча — гэта не проста ўвасабленне жаночай прыгажосці. Для яго найдаражэйшае ў жанчыне яе высокае прызначэнне прымірацъ, уціхамірваць згублівыя страсці.

Дзяўчынка к хлопчыку нагнулася і, слёзкі
Сціраючы яму, штось пачала казаць,
Каб заспакоіць плач — зусім як быццам маць,
І саліваліся ў жывы абраз ядыны
Той выгляд мацеры ды з воблікам дзяўчыны...

*«У вёсцы» (Т. 1. С. 133)*

Гімнам мацярынству, красе, дабраце сталі не толькі вершы аб беларускіх мадоннах, але і цыкл «Каханне і смерць». У вершах гэтага цыкла і «шлюбнае ложа», і першая трывога, і радасць маладой маці, якая адчула пад сваім сэрцам дзіця, і забабонны, амаль містычны страх перад невядомасцю, і нечалавечыя пакуты, у якіх нараджаецца жыццё. Каханне мацней смерці, яно перамагае смерць.

Слава тым, хто сілу мае
Смерць, не дрогнуўшы, спаткаць,
Хто ў мучэннях паміраe,
Каб жыццё дзіцёнку даць!

*«Тым вянкі суворай славы...» (Т. 1. С. 153)*

Жыве ў гэтых вершах памяць аб роднай маці, далёкай, страчанай і вельмі любімай.

Нядоўгі век мелі светлыя мары Максіма, звязаныя з Аняй Какуевай. Ды і наогул, у каханні яму не вельмі шанцавала. Але яго ўражлівую, надзеленую эмацыянальнай памяццю, артыстычную натуру заўсёды вабіў, хваляваў вобраз жанчыны. М. А. Кіціцынай, з якой Багдановіч пазнаёміўся ў час першай паездкі ў Крым, прысвяціў ён вершы «Я, бальны, бесскрыдлаты паэт» і «Цемень». Раман гэты не меў працягу. Нешчаслівым было і каханне Максіма да стрыечнай сястры Ані Гапановіч. Ёй прысвяціў паэт рукапісны зборнік «Зеленя», увабраўшы ў сябе дваццаць два вершы і перакладзены ім самім на рускую мову спецыяльна для Ані. Перадрукаваны ў першым акадэмічным выданні твораў паэта, зборнік гэты доўгі час лічыўся страчаным. І толькі некалькі дзесяцігоддзяў назад адшуканы намаганнямі Н. Б. Ватацы.

### *Фальклорныя матывы*

Цікавасць да народнай паэзіі не абмяжоўваецца ў М. Багдановіча толькі цыклам «У зачараваным лесе». Шчырым лірызмам, сардэчнасцю адзначаны створаныя на аснове народных песень вершы аб каханні, інтымных пачуц-

* Гілевіч Н. Удзячнасць і абавязак. Мн., 1982. С. 21—22.
** Гілевіч Н. Удзячнасць і абавязак. Мн., 1982. С. 24.

* Ватацы Н. Б. Шляхі. Мн., 1986. С. 53.

цях чалавека («Ой, лясы-бары ды лугі-разлогі!..», «Як прыйшла я на ток малаціць...», «Сярод вуліцы ў нас карагод...»). Апрацоўкай салдацкіх песень з'яўляюцца «Як Базыль у паходзе канаў...», «Цёмнай ноччу лучына дагарала...». На падставе танцавальных песень і мелодый створаны «Лявоніха», «На Лявонавай кашулі вышыты галубкі...». У беларускім фальклоры існуе цэлы цыкл пра Лявоніху (у запісах П. Шэйна і Е. Раманава). Паэт стварае свой вобраз працоўнай беларускай жанчыны, гасціннай, непасрэднай і шчырай, якая і працаваць і весяліцца ўмее.

Ты была заўсёды першай у танку —
І ў «Мяцеліцы», і ў «Юрцы», і ў «Бычку»;
А калі ты жаці станеш свой загон,
Аж дзівуецца нядбайліца Лявон.

*«Лявоніха» (Т. І. С. 259)*

На аснове этнаграфічных крыніц напісаны паэмы «Мушка-зелянушка і камарык — насаты тварык», «Максім і Магдалена». Паэма «Мушка-зелянушка і камарык — насаты тварык» добра адлюстроўвае быт народа, традыцыйныя звычаі і абрады. Як некаторыя чалавечыя слабасці добразычліва высмейваў паэт гультайства, няўмельства мушкі, што давялі да пагібелі небараку камара. Героі паэмы паводзяць сябе так, як у жыцці паводзілі сябе беларускія сяляне. Матыў нешчаслівага кахання, уласцівы народным казкам і песням, распрацаваны ў паэме «Максім і Магдалена». Паэт расказвае аб няроўным каханні хлопа да дачкі старога ваяводы. Галоўны герой твора не паўстанец, не рэвалюцыянер. Ён просты хлоп, якога зусім няпростым робіць каханне. Максім не ў сілах супрацьстаяць ваяводу і тым не менш гіне ён як сапраўдны герой. Паэт перадае сваё разуменне геразму напярэдадні рэвалюцыйных падзей, якія ён прадчувае.

Народная легенда лягла і ў аснову апошняга паэтычнага твора Багдановіча — балады «Страцім-лебедзь», якую некаторыя даследчыкі адносяць да жанру паэмы. Паводле легенды, адзін толькі Страцім-лебедзь адмовіўся ад Ноевага каўчэга, сам уступіўшы ў адзінаборства са стыхіяй. Страцім-лебедзь загінуў, бо не здолеў утрымаць птахаў, што паселі на яго. Легенда асуджала непакорнасць лебедзя, Багдановіч услаўляў яе. Гордая птушка ўвасабляла волю да барацьбы, высокую мараль, гераізм.

Страцім-лебедзь — горды, моцны птах.
Яго звычаі — арліныя,
Яго ўцехі — сакаліныя;
. . . . . . . . . . . . . . .

Узмахне крылом быццам бор шуміць,
Узмахне другім — што мяцель гудзіць.

*(Т. І. С. 274)*

У творы шырока выкарыстаны фальклорныя вобразна-маляўнічыя сродкі.

### *Пераклады і наследаванні*

Максім Багдановіч узбагаціў беларускую літаратуру не толькі цудоўнымі арыгінальнымі творамі, але і перакладамі выдатных здабыткаў паэтычнай культуры мінулага. Першы ў гісторыі беларускай літаратуры даў ён на роднай мове класічныя ўзоры антычнай і заходнееўрапейскай паэзіі. Дзякуючы М. Багдановічу на беларускай мове загучалі санеты, тэрцыны і іншыя ўзоры класічнага верша. Ён перакладаў творы Анакрэона, Гарацыя, Авідзія, Катула, Шылера, Гейне, Верлена і інш. У спадчыне Багдановіча ёсць пераклады Пушкіна, Шаўчэнкі, Франка. Творча апрацоўваў паэт і лепшыя ўзоры народных песняў: іспанскіх, скандынаўскіх, сербскіх, украінскіх, рускіх.



Багдановіч не проста перакладаў вершы старажытных паэтаў. Гэта была не толькі любоў, навеяная эстэтычнымі пачуццямі, хоць яны і мелі вялікае значэнне. Беларускі паэт творча наследаваў матывы класікаў, вобразы, формы, вершаваныя памеры. З дасканаласцю італьянскіх майстраў карыстаўся Багдановіч формай санета. Усім правілам класічнага санета адпавядае, напрыклад, яго верш «Паміж пяскоў Егіпецкай зямлі». У паэтычным наследаванні Багдановіча і захапленне чалавечай мудрасцю, харастввом формы, і імкненне ўзняць беларускую паэзію на адзін узровень з вышэйшымі дасягненнямі сусветнай паэтычнай культуры.

Ёсць чары у забытым, старадаўным;
Прыемна нам сталеццяў пыл страхнуць
І жыць мінулым — гэткім мудрым, слаўным,—

Мы любім час далёкі ўспамянуць.
Мы сквапна цягнемся к старым паэтам,
Каб хоць душой у прошлым патануць.

Таму вярнуўся я к рандо, санетам,
І бліснуў ярка верш пануры мой:
Як месяц зіхаціць адбітым светам,—

Так вершы ззяюць даўняю красой!

*«Тэрцыны» (Т. 1. С. 125)*

І няхай не ўсе формы, распрацаваныя Багдановічам, прыжыліся ў беларускай літаратуры, але дзякуючы яму, яны ёй вядомы. «Максім Багдановіч узняў некранутую да яго велізарнейшую глыбу і ўзбагаціў нацыянальна-беларускую літаратуру вялікімі скарбамі сусветнай культуры»*.

### *Празаік, крытык, публіцыст*

Першы друкаваны твор М. Багдановіча «Музыка» быў празаічны. Але ўласна прозы ў яго было мала. Прадстаўлена яна апавяданнямі і нарысамі на беларускай і рускай мовах, а таксама перакладамі ў большасці на рускую мову і з украінскай. Сярод празаічных твораў Багдановіча вылучаюцца апавяданні «Апокрыф» (1913) і «Апавяданне аб іконніку і залатару, людзях мудрых і красамоўных, кнігалюбцам нейкім дзеля славы божай ды размнажэння дабра паспалітага выкладзенае» (1914). Прысвечаны яны тэме мастацтва і стылізаваны пад скарынінскія прадмовы і пасляслоўі да Біблії. Тэму мастацтва працягваюць апавяданні «Шаман», «Сон-трава», «Мадонна» (на рускай мове). Месца дзеяння апавядання «Марына»—Вільня. Тут, як і ў апавяданні «Катыш», ёсць цікавыя апісанні і сцэнкі з дзіцячага жыцця. Паездкам у Феадосію і Стары Крым прысвечана некалькі нарысаў «Из летних впечатлений». У асноўнай масе апавяданні Багдановіча пры яго жыцці надрукаваны не былі.

У творчай спадчыне Багдановіча значнае месца належыць яго публіцыстычным творам. Некаторыя з іх выйшлі асобнымі брашурамі ў серыі «Библиотека войны». Сярод іх «Червонная Русь», «Братья-чехи», «Угорская Русь». Добразычліва і дасведчана піша пісьменнік пра гісторыю славянскіх народаў, іх культуру. Але больш за ўсё Багдановіча хвалявала праблема Беларускага Адраджэння, нацыянальна-вызваленчы і культурны рух у Беларусі («Белорусы», «На белорусские темы»). У артыкуле «Хто мы такія» ён піша: «Мы — трэці народ рускага кораню, завёмся б е л а р у с а м і, і старон-

* Майхровіч С. Максім Багдановіч: Жыццё і творчасць. Мн., 1958. С. 125.

ка наша завецца «Беларусь». Ёсць паміж нас праваслаўныя, ёсць і каталікі, але народ з нас адзін, бо ўва ўсіх адна гаворка, адны звычаі, адны песні, адна вопратка, адзін лад жыцця.

Беларусы! Мы — вялікі народ, нас дванаццаць мільёнаў, шырока раскінуліся мы і спрадвеку жывём тут. Гэта наш край, наша старонка...» (Т. 2. С. 347—348).

Глыбокі след пакінуў Багдановіч і ў літаратуразнаўстве і крытыцы. Ім напісаны шматлікія водгукі на кнігі гістарычнага, этнаграфічнага, сацыялагічнага характару, даследаванні па фальклору і этнаграфіі. Але больш за ўсё Багдановіча цікавіў лёс нацыянальнай літаратуры як формы выяўлення свядомасці. Багдановіча па праву называюць заснавальнікам беларускага літаратуразнаўства. У працах «Кароткая гісторыя беларускай пісьменнасці да XVI сталецця», «Белорусское возрождение» Багдановіч, ідучы ўслед за прафесарам Я. Карскім, зрабіў сістэматычны агляд нашай пісьменнасці, вылучыў у ёй найбольш значныя імёны і з'явы. Сярод крытычных артыкулаў Багдановіча выдзяляюцца «Глыбы і слаі»— агляд беларускай пісьменнасці 1910 г. і «За тры гады» — агляд беларускай пісьменнасці за 1911—1913 гг. Значнае месца ў іх адводзіцца аналізу творчасці Я. Купалы і Я. Коласа. У асобе Багдановіча дарэвалюцыйныя Купала і Колас набылі свайго першага грунтоўнага крытыка. Пісаў М. Багдановіч пра творчасць В. Дуніна-Марцінкевіча, Я. Лучыны, З. Бядулі, Ядвігіна Ш. Пільна сачыў за літаратурным рухам на Беларусі ў пачатку XX ст., займаўся папулярызацыяй дасягненняў маладой беларускай літаратуры.

### Багдановіч і нашчадкі

Адносіны да творчасці М. Багдановіча пасля яго смерці складваліся пароznаму. Былі свае ўзлёты і спады. Пра паэзію М. Багдановіча і яго ролю ў развіцці беларускай літаратуры пісалі яшчэ ў дарэвалюцыйны час відныя дзеячы культуры: украінскі літаратуразнаўца І. Свянціцкі, рускі публіцыст і літаратуразнаўца А. Пагодзін, чэшскі вучоны-славіст А. Чэрны, польскі літаратар У. Рагоўскі... У 20-я гады выйшаў першы збор твораў паэта, а ў 30-я М. Багдановіча неабгрунтавана абвінавацілі ў фармалізме, эстэцтве, сімвалізме. Рэха той крытыкі гучала доўгія гады. Спатрэбілася не адно дзесяцігоддзе, каб паставіць імя паэта на тое пачэснае месца, якое ён заваяваў сваімі творамі і грамадзянскай дзейнасцю. Гэтаму дапамаглі шматлікія даследаванні, кнігі, артыкулы, архіўныя знаходкі, з'явіўшыся ў выніку вывучэння спадчыны М. Багдановіча. Першымі фундаментальнымі працамі, прысвечанымі яго творчасці сталі кнігі **С. Майхровіча** «Максім Багдановіч» (1958) і **А. Лойкі** «Максім Багдановіч» (1966). Роля фальклору як важнага фактару ў станаўленні эстэтычных поглядаў маладога паэта раскрываецца ў кнізе **М. Грынчыка** «Максім Багдановіч і народная паэзія» (1963). Пра паэта і чалавека, пра яго жыццё і творчасць, складаны і цяжкі лёс расказваюць кнігі **М. Стральцова** «Загадка Багдановіча» (1969) і **Р. Бярозкіна** «Человек на заре» (1970). У 1986 г. гэты твор пад назвай «Чалавек напрадвесні» пераклала на беларускую мову Ю. Канэ. Шмат сіл аддаў вывучэнню жыцця і творчасці М. Багдановіча **А. Бачыла.** Усё пачалося з лібрэта да оперы «Зорка Венера». Пасля былі часопісныя публікацыі, кніга «Дарогамі Максіма», якая вытрымала ўжо не адно выданне. У апошнім — прыводзяцца новыя факты з жыцця М. Багдановіча і яго родных. Вынікам шматгадовай даследчай і пошукавай работы сталі кнігі старэйшага бібліёграфа рэспублікі і літаратуразнаўцы **Н. Б. Ватацы** «Шлях паэта» (1975) і «Шляхі» (1986), дзе сабраны пісьмы, успаміны, біяграфічныя матэрыялы, артыкулы пра паэта, якія значна пашыраюць уяўленне аб ім і яго акружэнні.

«Годам Максіма Багдановіча» стаў юбілейны 1981 год. Пра паэта загаварылі газеты, часопісы, радыё, тэлебачанне. Каля вёскі Ракуцёўшчына быў закладзены Максімаў сад. У гэтым жа годзе ў Мінску быў адкрыты помнік паэту. Адліты з бронзы вярнуўся ён у родны горад, каб назаўсёды застацца сярод сваіх землякоў.

Сёлетні год аб'яўлены ЮНЕСКА годам Максіма Багдановіча. Святочныя ўрачыстасці з нагоды юбілея паэта ўжо ўзялі свой пачатак з Ялты, дзе адбыўся вечар-ушанаванне памяці паэта. Рэспубліканскім аргкамітэтам па падрыхтоўцы і святкаванню юбілею М. Багдановіча зацверджана разнастайная праграма. Адпаведна ёй у вёсцы Ракуцёўшчына 1-га верасня адбудзецца Усебеларускае свята паэзіі. Адначасова Дзень Багдановіча пройдзе ва ўсіх навучальных установах рэспублікі. Юбілей паэта адзначаць у Гродне, Ніжнім Ноўгарадзе, Яраслаўлі, дзе адкрыецца дом-музей Багдановіча, Кіеве, Львове, Вільні, Маскве... Парыжы. На снежань прызначана адкрыццё Літаратурнага музея Максіма Багдановіча ў Мінску. У Доме літаратара адбудзецца канцэрт з прам'ерным прадстаўленнем новых музычных твораў на вершы паэта.

### Багдановіч у мастацтве і музыцы

«Паэзія Багдановіча высякае іскры агню з чалавечай душы. Яго творчасць, яго літаратурная спадчына для многіх і многіх — невычэрпная крыніца натхнення»*. Вобраз Багдановіча, яго паэзія жывяць не адно пакаленне беларускіх мастакоў, кампазітараў, паэтаў.

Сярод першых твораў, прысвечаных М. Багдановічу, скульптурны партрэт А. Грубэ «Максім Багдановіч» (1927). Сама скульптура, на жаль, загінула ў ліхалецці вайны. Зберaглася толькі рэпрадукцыя, па якой можна меркаваць пра мастацкую вартасць арыгінала. Нельга не згадаць скульптурныя кампазіцыі А. Анікейчыка «Сны аб Радзіме» і А. Шатэрніка «М. Багдановіч». Арганічна ўвайшоў у наша жыццё помнік паэта на Траецкай гары ў Мінску скульптара С. Вакара.

У жывапісу адным з першых звярнуўся да вобраза паэта П. Сергіевіч («Максім Багдановіч», 1967). Багдановічу прысвяцілі свае работы мастакі І. Рэй («Шлях паэта»), А. Ксяндзоў («Увечары. Сямейны партрэт»), Л. Шчамялёў («На зямлі бацькоў», «У краіне светлай»), Н. Шчасная («Быць можа я не скончу жыць. М. Багдановіч»). Паэзія Багдановіча ажывае ў творах М. Казакевіча, Г. Вашчанкі, П. Шарыпы, В. Ціханава. Спробай прачытання лірыкі паэта сталі графічныя работы А. Пашкевіча, А. Лапіцкай, М. Басалыгі. Графік І. Пратасеня стварыў аркуш «Максім Багдановіч і Зоська Верас (Л. А. Сівіцкая) у Мінску. Восень 1916 г.». Шэраг цікавых твораў прысвяцілі Багдановічу мастакі-плакатысты.

Тонкая музычнасць твораў паэта выклікае асаблівую прыхільнасць нашых кампазітараў. Многія яго вершы ляглі ў аснову самых разнастайных твораў беларускай вакальнай музыкі. Амаль поўнасцю заснаванай на вершах паэта з'яўляецца опера «Зорка Венера» (кампазітар Ю. Семяняка, лібрэта А. Бачылы). На вершы Багдановіча стварылі рамансы М. І. Аладаў, А. В. Багатыроў, А. Я. Туранкоў, Я. А. Глебаў, І. М. Лучанок, Л. К. Захлеўны. Народнымі песнямі сталі ў нас «Зорка Венера» (апрацоўка А. Багатырова і А. Туранкова), «Слуцкія ткачыхі» (музыка А. Багатырова, а таксама А. Туранкова).

### Творы М. Багдановіча

**Вянок:** Кніжка выбраных вершоў.— Вільня, Друкарня Марціна Кухты, 1913.—121 с.— Факс. выд.: Мн.: Маст. літ., 1985.

---

* Марачкін А. «За між персідскага ўзору, цвяток радзімы васілька» // Беларус. мова і літ. у шк. 1988. № 6. С. 54.

**Творы** М. Багдановіча: У 2 т. / Пад рэд. І. І. Замоціна.— Мн.: Інбелкульт, 1927—1928.— Т. 1—2.

Т. 1: Вершы. Апавяданьні. Тэкст. Варыянты. Увагі / Падрыхт. літ. камісіі Інбелкульту. 1927. 504 с., 1 л. партр.

Т. 2: Прозаічныя творы. Тэкст. Увагі. Дадаткі / Падрыхт. каміс. для выданьня твораў беларус. пісьменьнікаў. 1928. 421 с.

**Збор** твораў: У 2 т. / Рэдкал.: В. В. Барысенка і інш.— Мн.: Навука і тэхніка, 1968.— Т. 1—2.

Т. 1: Вершы, паэмы, пераклады. 551 с.: іл., партр.

Т. 2: Проза, літаратурна-крытычныя і публіцыстычныя артыкулы, пісьмы. 575 с.: іл.

**Творы:** Вершы, апавяданні, нарысы / Рэдкал.: Барысенка В. В. і інш.; Уступ. арт. Н. С. Перкіна.— Мн.: Выд-ва АН БССР, 1957.— 591 с.: іл., 1 л. партр.

**Выбранае:** [Вершы] / Уклад. В. Чарняўскай; Аўт. уступ. арт. А. Лойка.— Мн.: Маст. літ., 1977.— 190 с.: іл.— (Б-ка беларус. паэзіі).

**Вершы:** Для сярэд. і стар. шк. узросту / Склад М. А. Казбярук; Уступ. арт. Н. Гілевіча.— Мн.: Юнацтва, 1981.— 127 с.: іл.— (Шк. б-ка).

**Маладзік:** Лірыка / Склад. і аўт. уступ. арт. А. Лойка.— Мн.: Беларусь, 1968.— 290 с.: іл., партр.

**Мушка**-зелянушка і Камарык — насаты тварык: Для дашк. узросту / Мал. Я. Куліка.— Мн.: Маст. літ., 1975.—16 с.: іл.— (Мая першая кніжка).

### *Творы на рускай мове*

**Венок:** Лирика: Для ст. шк. возраста / Пер. с белорус. Б. Спринчана; Вступ. ст., сост. и примеч. В. П. Рагойши; Худож. А. А. Лапицкая.— Мн.: Юнацтва, 1985.— 127 с.: ил.— (Поэтич. б-ка).

**Избранные** произведения: Пер. с белорус. / Вступ. ст. С. Майхровича.— М.: Гослитиздат, 1953.—295 с., 1 л. портр.

**Узор** василька: Избр. лирика: Пер. с белорус. / Сост. С. Панизник; Редкол.: Н. Кислик (ред. переводов) и др.; Предисл. Н. Гилевича.— Мн.: Маст. літ., 1985.—142 с., 1 л. портр.— (Белорус. поэзия).

**Стихотворения:** Пер. с белорус. / Сост. и авт. вступ. ст. И. Поступальский; Худож.: В. Филиппов.— М.: Худож. лит., 1971.— 190 с.: ил.

### Аб жыцці і творчасці паэта

**Шлях** паэта: Зб. успамінаў і біягр. матэрыялаў пра М. Багдановіча / Склад. Н. Б. Ватацы.— Мн.: Маст. літ., 1975.— 319 с.: іл.

**Содаль У.** Крупінкі // Полымя. 1988. № 12. С. 199—206.

Шмат гадоў аўтар ліставаўся з З. Верас. У артыкуле прыводзяцца ўрыўкі з пісьмаў, у якіх яна ўспамінае М. Багдановіча.

**Зубараў Л. І.** Максім Багдановіч: [Навук.-папул. выд.].— Мн.: Універсітэцкае, 1989.— 263 с.: іл., [8] л. іл.

**Зуборев Л. И.** Крик буревестника. Ист. докум. повесть о М. Горьком и Богдановичах / Предисл. М. М. Пешковой.— Мн.: Маст. літ., 1989.— 327 с.: ил., 8 л. фот.

**Бярозкін Р. С.** Чалавек напрадвесні: Расказ пра М. Багдановіча / Пер. з рус. Ю. М. Канэ; Маст. У. М. Вішнеўскі.— Мн.: Нар. асвета, 1986.— 176 с.: іл.

**Гілевіч Н. С.** Ты не згаснеш, ясная зараначка...: [Агляд творчасці] // Гілевіч Н. С. Удзячнасць і абавязак. Мн., 1982. С. 19—32.

**Гніламёдаў У. В.** Максім Багдановіч: «Разам ляцім да зор...»: [Агляд творчасці] // Гніламёдаў У. В. Класікі і сучаснікі. Мн., 1987. С. 47—57.

**Рагойша В. П.** Максім Багдановіч // Рагойша В. П. Вяршыні: З невядомага і забытага пра Я. Купалу, Я. Коласа, М. Багдановіча. Мн., 1991. С. 140—192.



**Бачыла А. М.** Дарогамі Максіма Багдановіча.— 2-е выд., перапрац. і дап.— Мн.: Нар. асвета, 1983.— 104 с., 8 л. іл.

Тое ж // Зб. тв.: У 3 т. Мн., 1986. Т. 1. С. 245—355.

**Ватацы Н. Б.** У вянок Максіму Багдановічу // Ватацы Н. Б. Шляхі: Гіст.-літ. арт. Мн., 1986. С. 5—144.

**Кароткая Т.** Маці паэта // Беларус. мова і літ. у шк. 1991. № 5. С. 69—72.

*З раней выдадзенага пра паэта раім звярнуць увагу на наступныя працы:*

**Замоцін І.** М. Багдановіч: Крыт.-біогр. нарыс // Багдановіч М. Творы. Мн., 1928. Т. 2. С. VII—LXL.

**Ларчанка М. Г.** Творчасць Максіма Багдановіча: Стэнаграма публічнай лекцыі, прачытанай у г. Мінску.— Мн.: Выд-ва АН БССР, 1949.— 19 с.

**Майхровіч С. К.** Максім Багдановіч: Жыццё і творчасць.— Мн.: Дзяржвыд БССР, 1958.—202 с., 1 л. партр.

**Лойка А. А.** Максім Багдановіч.— Мн.: Навука і тэхніка, 1966.— 335 с.

**Стральцоў М. Л.** Загадка Багдановіча.— Мн.: Беларусь, 1969.— 120 с.

**Лойка А. А.** Беларуская паэзія пачатку XX стагоддзя: Некаторыя заканамернасці і асаблівасці.— Мн.: Выд-ва БДУ, 1972.— 240 с.

Пра мастацкія пошукі М. Багдановіча гл. на с. 86—234.

*Цікавасць да М. Багдановіча ў беларускім асяроддзі за мяжой адлюстроўвае кніга:*

**Глыбінны У.** Пад Лебядзіным Знакам: Аповесьць пра М. Багдановіча.— Нью-Йорк: Беларуска-амэрыканскі навукова-літаратурны клюб, 1983.—95 с.

### *Асобныя моманты жыцця і творчасці М. Багдановіча*

**Бярозкін Р. С.** «Разам ляцім да зор...»: [Багдановіч — лірык] // Бярозкін Р. С. Паэзія — маё жыццё. Мн., 1989. С. 17—26.

**Кабаковіч А. К.** Паэзія Максіма Багдановіча: Дыялектыка рацыян. і эмацыян.— Мн.: Навука і тэхніка, 1978.— 136 с.

**Грынчык М. М.** Максім Багдановіч і народная паэзія.— Мн.: Дзяржвыд БССР, 1963.— 211 с., 1 л. партр.

**Колас Я.** Выдатнейшы паэт і крытык // Іменем чалавечнасці: Зб. крытыч. арт. Мн., 1986. С. 51.

**Мушынскі М. І.** Жыццядзейнасць традыцый пачынальніка: Багдановіч — крытык. Прабл. метадалогіі // Мушынскі М. І. Каардынаты пошуку. Беларус. крытыка: Набыткі, перспектывы. Мн., 1988. С. 162—189.

**Драбеня В. С.** М. Багдановіч—даследчык беларускай прозы пачатку XX стагоддзя // Весн. БДУ. Сер. 4, Філалогія, журналістыка, педагогіка, псіхалогія. 1985. № 2. С. 3—5.

**Ермаловіч М. І.** Яму была падуладна // Помнікі гісторыі і культуры Беларусі. 1981. № 4. С. 21—23.

Погляды М. Багдановіча на гісторыю Беларусі.

**Лапідус Н.** Песні розных народаў у пераспеве Максіма Багдановіча // Полымя. 1988. № 12. С. 192—198.

М. Багдановіч — перакладчык.

**Адамович Г.** Мадонны: Опыт літ.-психол. исслед. // Нёман. 1986. № 3. С. 154—161.

О женщинах, заставивших звучать лиру поэта то задумчиво-печально, то восторженно-оптимистически.

**Войтенков Н., Калугин С.** Крымское лето Максима Богдановича // Нёман. 1980. № 3. С. 168—172.

**Ждановіч В.** А дзе той надпіс «Вераніка»? / Фота аўт. // Маладосць. 1981. № 12. С. 149—155.

Даследчыкі сцвярджаюць, што вершаванае апавяданне «Вераніка» нараджалася ў Ракуцёўшчыне.

**Микута В.** «В лицее» // Нёман. 1989. № 3. С. 171—172.

Гипотеза о принадлежности заметки «В лицее» перу М. Богдановича.

**Саламевіч Я.** Таямніца аўтографа Максіма Багдановіча // Свитязь: Альманах библиофилов Белоруссии. Мн., 1989. С. 117—122.

Сцвярджаецца аўтарства невядомых раней твораў са спадчыны М. Багдановіча: верша «Современным поэтам» і артыкула «Народное образование». Прыводзяцца самі тэксты.

**Рагойша В. П.** Два штрыхі да партрэта // Рагойша В. П. Кантакты. Мн., 1982. С. 29—36.

Пра адзін з нямногіх аўтографаў М. Багдановіча — артыкул «Краса и сила: (Опыт исследования стиха Т. Г. Шевченко)» і сувязі паэта з рэдакцыяй газеты «Наша ніва» у час знаходжання ў Ялце.

**Скалабан В.** Невядомы артыкул паэта // Полымя. 1981. № 12. С. 189—190.

Аб апошнім прыжыццёвым выступленні М. Багдановіча ў беларускім друку, артыкуле «Агляд працы за першы год Мінскага Аддзела Беларускага Таварыства для помачы пацярпеўшым ад вайны» за подпісам М. Осьмака. На с. 190—191 прыводзіцца тэкст гэтага артыкула.

**Николаева Э. А.** М. Богданович на страницах «Нашай нівы» // История книги, источниковедение и библиотечное дело: (Сб. науч. ст.). Мн., 1984. С. 37—47.

**Верабей А. Л.** Непаўторнасць музы Багдановіча // Верабей А. Л. Беларуска-рускі паэтычны ўзаемапераклад 20—30-х гадоў. Мн., 1990. С. 102—114.

Пра пераклад твораў М. Багдановіча на рускую мову.

**Гапова В.** Где же архив Максима-книжника? // Нёман. 1984. № 7. С. 147—152.

Архив был передан в 1923 г. отцом поэта в Институт белорусской культуры в Минске. Автор считает, что архив этот не погиб в годы второй мировой войны и существует где-то поныне.

*Літаратурныя паралелі:*

**Праневіч Г. М.** Скарынінскі прататып у творчасці Максіма Багдановіча // Весн. БДУ. Сер. 4, Філалогія, журналістыка, педагогіка, псіхалогія. 1983. № 2. С. 5—9.

**Стральцоў М. Л.** На пачатку ўсіх пачаткаў // Стральцоў М. Л. Выбранае: Проза. Паэзія. Эсэ. Мн., 1987. С. 448—458.

Паэтычны трохкутнік Купала, Колас, Багдановіч.

**Івашын В. У.** У рытме паскоранага развіцця // Івашын В. У. Да вышынь рэалізму: Асноўныя тэндэнцыі развіцця беларус. дакастр. і сав. літ. Мн., 1983. С. 32—90.

Разглядаюцца літаратурна-эстэтычныя арыентацыі Купалы, Коласа і Багдановіча.

**Бярозкін Р. С.** Купала, Багдановіч і руская паэзія: [Раздзел] // Бярозкін Р. С. Свет Купалы; Звенні: Літ. крытыка: Выбранае. Мн., 1981. С. 227—571.

**Каваленка В. В.** Максім Багдановіч і пошукі рускай паэзіі пачатку XX стагоддзя // Весн. БДУ. Сер. 4, Філалогія, журналістыка, педагогіка, псіхалогія. 1986. № 3. С. 3—5.

**Каваленка В. В.** Некаторыя асаблівасці тыпалагічнай блізкасці ў творчасці Максіма Багдановіча і А. С. Пушкіна // Весці АН БССР. Сер. грамад. навук. 1985. № 6. С. 107—115.



*Творчая сувязь М. Багдановіча з пушкінскай спадчынай разглядаецца таксама ў працах: М. Ларчанкі, С. Майхровіча, А. Лойкі, Р. Бярозкіна.*

**Ларчанка М. Р.** М. Багдановіч і ўкраінская літаратура // Ларчанка М. Р. Літаратурнае пабрацімства славян. Мн., 1984. С. 68—75.

**Андрэйчанка Т. П.** Ідэал прыгажосці ў паэзіі Максіма Багдановіча і Івана Краскі // Весці АН БССР. Сер. грамад. навук. 1990. № 3. С. 89—96.

**Андрэйчанка Т. П.** Уплыў паэтыкі Поля Верлена на творчасць Івана Краскі і Максіма Багдановіча // Весці АН БССР. Сер. грамад. навук. 1989. № 6. С. 87—93.

*З нагоды юбілеяў паэта*

**Гілевіч Н. С.** Слова пра Максіма Багдановіча: [Дакл. на ўрачыстым вечары, прысвеч. 90-годдзю з дня нараджэння паэта, 9 снеж. 1981 г.] // Гілевіч Н. С. Покліч жыцця і часу: Публіцыст. выступленні і арт. Мн., 1983. С. 173—187.

**Да 90-годдзя** з дня нараджэння Максіма Багдановіча // Маладосць. 1981. № 12. С. 140—147. Са зместу: Я. Брыль. Яго імя; В. Вярба. І ясны ён, як зорак сны...; А. Лойка. Чакаю новага прачытання...; Цвірка К. Вера ў веліч; У. Марук. Адкрыццё зоркі.

**Барадулін Р. І.** Геній роднага слова: [Да 75-годдзя М. Багдановіча] // Барадулін Р. І. Парастак радка, галінка верша. Мн., 1987. С. 23—25.

**Янішчыц Я.** З Максімам Багдановічам: [Да 95-годдзя паэта] // Полымя. 1986. № 12. С. 190—193.

*Па памятных мясцінах М. Багдановіча*

**Пяткевіч А.** «...І Нёман недалёка»: [Гродзенскія адрасы сям'і Багдановічаў] // Беларус. мова і літ. у шк. 1991. № 3. С. 76—77.

**Чыркві М. А.** Максім Багдановіч у Мінску=Максим Богданович в Минске / Фота В. І. Ждановіча.— Мн.: Полымя, 1986.—32 с.: іл.

Пра в. Ракуцёўшчына на Маладзечаншчыне расказваюць наступныя матэрыялы:

**Каханоўскі Г. А.** У родным краі.— Мн.: Полымя, 1983.—16 с.: іл.

**Марціновіч А.** «Страніца лепшая ў штодзённіку жыцця!» // Род. прырода. 1985. № 5. С. 14—15. (Мой родны кут).

**Мікута В.** Яраслаўскае акружэнне Максіма Багдановіча // Шляхам гадоў: Гіст.-літ. зб. Мн., 1990. С. 181—186.

**Ливицкая З.** Здесь жил Максим Богданович: [Ялта] // Нёман. 1982. № 3. С. 187—188.

*Ушанаванне памяці*

**Кохановский Г.** Некролог в Минском вестнике // Нёман. 1982. № 8. С. 170—171.

О некрологе Н. Мочульского «М. А. Богданович» 1917 г. Приводится текст самого некролога.

**Гарэцкі М. І.** На ўгодкі па М. Багдановічу. // Гарэцкі М. І. Творы. Мн., 1990. С. 231—232.

**Хадкевіч Л.** Да адкрыцця Літаратурнага музея Максіма Багдановіча // Шляхам гадоў: Гіст.-літ. зб. Мн., 1990. С. 359—361.

**Пучынскі У.** Тут жыў Багдановіч / Фота С. Плыткевіча // Нар. газета. 1991. 27 чэрв.

Да адкрыцця ў Мінску «Беларускай хаткі»— філіяла музея Максіма Багдановіча.

**Бічэль-Загнетава Д. І.** Пошукі Максіма Багдановіча // Музей і развіццё гістарычнага краязнаўства: Матэрыялы рэсп. навук.-практ. канф., прысвеч.

70-годдзю Гродзен. дзярж. гіст.-археалаг. музея, 8—9 кастр. 1990 г. Гродна, 1990. С. 12—14.

Аб дзейнасці музея, звязанай з імем М. Багдановіча.

**Ляшковіч В.** Знак на паэтавай сцяжынцы // ЛіМ. 1991. 17 мая (№ 20). С. 5.

Аб адкрыцці 18 чэрвеня 1977 г. памятнага Знака ў вёсцы Ракуцёўшчына — першага на той час помніка паэту ў Беларусі.

**Каханоўскі Г. А.** Максімаў сад // Каханоўскі Г. А. Повязь часоў. Мн., 1985. С. 23—25. (Па родным краі).

Сад закладзены каля вёскі Ракуцёўшчына да 90-годдзя паэта.

**Барахович А.** Память — в бронзе, память — в сердце: [Об открытии мемориал. доски М. Богдановичу в г. Горьком] // Нёман. 1985. № 3. С. 165—166.

*У дапамогу настаўнікам і вучням*

**Барсток М. М.** Максім Багдановіч у школе: Кн. для настаўніка.— 3-е выд., перапрац. і дап.— Мн.: Нар. асвета, 1991.— 109 с.

**Лойка А. А.** Максім Багдановіч (1891—1917) // Лойка А. А. Гісторыя беларускай літаратуры: Дакастр. перыяд: У 2 ч. 2-е выд., дапрац. і дап. Мн., 1989. Ч. 2. С. 298—350.

**Міхайлаў М. Р.** Максім Багдановіч // Беларуская дзіцячая літаратура: Вучэб. дапаможнік для ВНУ. 2-е выд., дапрац. і дап. Мн., 1980. С. 50—58.

**Максим Адамович Богданович (1891—1917)** // Антология педагогической мысли Белорусской ССР. М., 1986. С. 237—242.

**Ляшук В. Я.** У вянок Максіму Багдановічу: (Вобраз паэта ў сучаснай беларус. лірыцы) // Ляшук В. Я. Урокі пазакласнага чытання: 4—7 класы. Мн., 1984. С. 79—85.

**Ляшук В.** Сістэма вывучэння паэзіі Максіма Багдановіча ў VII класе // Беларус. мова і літ. у шк. 1991. № 2. С. 19—24; № 3. С. 13—17. (У вянок Максіму).

**Максім Багдановіч:** Жыццё, творчасць: Матэрыялы для выстаўкі ў школе / Уступ. арт. А. Лойкі.— Мн.: Нар. асвета, 1968.— 8 с., 48 с.: іл.— (Альбом-выстаўка ў школе).

**Багдановіч і музыка**

**Васільева В. І.** Максім Багдановіч і музыка // Нар. асвета. 1986. № 3. С. 54—58.

**Алейнікава Э. А.** Паэзія М. Багдановіча ў творчасці беларускіх кампазітараў // Весці АН БССР. Сер. грамад. навук. 1988. № 6. С. 89—96.

**Нисневич И. Г.** Поэт и музыка: (Максим Богданович) // Нисневич И. Г. Музыкально-критические статьи. Л., 1984. С. 23—36.

**Белькевич С. И.** Поэзия Максима Богдановича в белорусской вокальной музыке // Вопр. культуры и искусства Белоруссии. 1983. Вып. 2. С. 8—16.

**Нікалаева Э.** Музыка перш за ўсё: Да пытання ўзаемадзеяння музыкі і літаратуры на прыкладзе творчасці М. Багдановіча // Мастацтва Беларусі. 1986. № 5. С. 38—41.

**Серых В.** Музыка слова // Маладосць. 1987. № 5. С. 151—156. (Спадчына).

Кампазітар Валянціна Серых гаворыць пра свой музычны цыкл, створаны на словы М. Багдановіча.

**Рагойша В.** Яркі дэбют Багдановіча-музыказнаўца: Да гісторыі спрэчкі М. Багдановіча і Б. Асаф'ева // Мастацтва Беларусі. 1990. № 4. С. 56—58.



*Музычныя творы на словы М. Багдановіча*

**Абеліёвіч Л. М.** Рамансы паводле тэкстаў М. Багдановіча. — Мн.: Беларусь, 1982.— 31 с.— Змест: Вечнасць; Ты быў, як месяц, адзінокі; Завіруха; Ноч; Зімовы вечар.

**Аладов Н. И.** Скрылась кветамі ў полі магіла... // Аладов Н. И. Романсы. Мн., 1976. С. 17—22.

**Кузняцоў І.** Ноч // Кузняцоў І. У родным краі: Малюнкі для хору а капэла. Мн., 1961. С. 16—19.

**Сурус Г.** Теплый вечер; Зимняя дорога // Романсы советских композиторов: Для баса, баритона и фп. М., 1981. С. 15—26.

**Туранкоў А.** Мушка-зелянушка // Туранкоў А. Вакальныя творы. Мн., 1961. С. 33—36.

**Тырманд Э.** Хоры (а capella) / Словы М. Багдановіча.— Мн.: Дзяржвыд БССР, 1956.— 23 с.— Змест: Зімой; Завіруха; Зімовая дарога.

**Тырманд Э.** Вечар / Э. Тырманд. Ты быў, як месяц, адзінокі / Л. Абеліёвіч // Песні Беларусі: Вакальныя творы беларус. кампазітараў. К., 1970. С. 44—46, 58—62.

**Тырманд Э.** Напілося сонца // Тырманд Э. Хоры (а капэла). Мн., 1961. С. 17—23.

**Максім Багдановіч** (1891—1917).— М.: Мелодия, 1981.— I грп.— М40-43765-6.

Бок I: Музыка: Алегарыч. апавяданне; Зорка Венера (Муз. нар., апрац. А. Багатырова); Тырманд Э. Вечар; Семяняка Ю. Слуцкія ткачыхі: Хор з оперы «Зорка Венера»; Арыя Максіма: З оперы «Зорка Венера». Бок 2: Багатыроў А. На чужыне; Сурус Г. Зімовая дарога; Захлеўны Л. З вершаў народнага складу: I. Скірпуся. 2. Хоць і зорачка. 3. На Лявонавай кашулі; Серых В. Возера; Туранкоў А. Нявесела камару; Лучанок І. Вераніка.

**Багдановіч у мастацтве**

**Марачкін А.** «Заміж персідскага ўзору, цвяток радзімы васілька»: Вобраз М. Багдановіча ў беларус. выяўленчым мастацтве // Беларус. мова і літ. у шк. 1988. № 6. С. 54—62.

**Матусевич К.** «І весь у спомінах устане, ажыве...»// Нёман. 1982. № 4. С. 172—176.

О художественной выставке, посвященной 90-летию со дня рождения поэта.

**Лейтман Ф.** Любімы вобраз // Мастацтва Беларусі. 1984. № 12. С. 36.

Аб рабоце скульптара С. Вакара над вобразам М. Багдановіча.

**Секушенко Г.** Памятник поэту [,выполненный скульптором С. Вакаром] // Нёман. 1981. № 12. С. 179.

**Рэспубліканская выстаўка выяўленчага мастацтва, прысвечаная 90-годдзю з дня нараджэння Максіма Багдановіча (8—17 снеж. 1981 г.):** Каталог / М-ва культуры БССР, Саюз мастакоў БССР.— Мн.: Беларусь, 1984.— 31 с.: іл.

*Ілюстрацыі*

**Альшэўскі У.** Партрэт Максіма Багдановіча // Беларусь. 1986. № 7. Паміж с. 18—19.

**Пракапцоў У.** Памяці М. Багдановіча. Апошні санет, 1985. Алей // Маладосць. 1987. № 1. Паміж с. 128—129.

**Пратасеня І.** М. Багдановіч і Зоська Верас у Мінску, 1916 г., 1981. Аловак // Маладосць. 1987. № 2. 3-я с. вокл.

**Лапіцкая А.** Максім Багдановіч, 1981. Літаграфія // Маладосць. 1984. № 8. 2-я с. вокл.

**Метлицкий А. И.** Максим Богданович, 1982. Бронза // Молодые художники о Родине: Живопись, скульптура, графика, декор.-прикл. искусство, сценография на выст. «СССР — наша Родина». М., 1985. С. 140.

**Вакар С. М.** Памятник Максиму Богдановичу // Прокопцов В. В поисках красоты и гармонии. Мн., 1988. Ил. 32.

## Бібліяграфія

**Мачульскі В.** Апіс рукапісаў М. Багдановіча і матар'ялаў да яго біографіі: [Паасобны адбітак з II тому акадэмічнага выданьня М. Багдановіча].— Мн., 1929.— [15 с.].

**Ватацы Н. Б.** Максім Багдановіч: Паказальнік твораў, аўтографаў і крытыч. літаратуры / Дзярж. б-ка БССР імя У. І. Леніна.— Мн., 1977.— 155 с.

**Максім Багдановіч:** Да 70-годдзя з дня нараджэння: Бібліягр. даведнік / Дзярж. б-ка БССР імя У. І. Леніна; Склад. Н. Б. Ватацы.— Мн.: Выд-ва газ. «Мінская праўда», 1961.— 77 с., 1 л. партр.

(Раздзел «Максім Багдановіч у мастацкай літаратуры» гл. на с. 15, 3-я с. вокл. агульнай часткі бюлетэня).

Складальнік *Т. Я. Мамедава*
Рэдактар *К. Д. Варанько*

Дзяржаўная бібліятэка БССР імя У. І. Леніна.